ўзоры змешчаны ў зборніках Е.Раманава, М.Федароўскага. Тры браты (царскія сыны) шукаюць сабе жонак па запавету бацькі: «Выйдзіце, сыны, з хаты і пусціце свае стрэлы. Куды паляціць страла, там і шукайце сабе жонак». Страла старэйшага ўпала на княжацкі (купецкі) двор, і ажаніўся сын з князёўнай (купецкай дачкою). Страла сярэдняга ўпала на баярскі двор, і ажаніўся ён з баярскай дачкою. А страла малодшага сына, Івана, упала на балота, і стала яму жонкай лягушка — «брыдкая і пачварная істота», якая ў народзе лічылася «нячыстай». Сын, аднак, не асмельваецца аспрэчыць волю бацькі. Кожная з жонак павінна паказаць свае ўменні: вышыць ці выткаць ручнік, спячы хлеб (каравай). Лягушка выконвае даручэнні лепш за іншых. Яе здольнасці захапляюць і выклікаюць здзіўленне. Аднак уменні лягушкі не мяняюць адносін да яе — яна застаецца для ўсіх пачварай. Апошняе заданне бацькі — прывесці паказаць сваіх жонак — з'яўляецца кульмінацыйным момантам сюжэта. Герой саромеецца лягушкі, аднак пераадольвае свае сумненні і гатовы паказаць жонку людзям: ён чакае яе прыезду на пір і не адказвае на насмешкі братоў. Напружанне змяняецца радасцю, калі лягушка аказваецца прыгожай царэўнай («ні пяром апісаць, ні ў казцы расказаць»). Іван спальвае жабіну скуру, і царэўна назаўсёды застаецца чалавекам, «бо гэта скура была яе закляццем». У іншых варыянтах спальванне скуры становіцца завязкай новага сюжэта СУС 400 «Муж шукае ўкрадзеную жонку».

*Літ.*: Р о м а н о в Е.Р. Белорусский сборник. Вып. 6. Могилев, 1901; Чарадзейныя казкі. Ч. 2. Мн., 2003; F e d e r o w s k i M. Lud białoruski. T. 2. Kraków, 1902.

*В.А.Сухая.*

**ЦВІ́РКА** Кастусь (Канстанцін Аляксеевіч, н. 28.3.1934, в. Зялёная Дуброва Старадарожскага р-на), паэт, перакладчык, краязнавец, фалькларыст, этнограф. Кандыдат гістарычных навук (1972). Скончыў БДУ (1958). Настаўнічаў, працаваў у друку, на Бел. радыё. З 1965 ва Упраўленні па распаўсюджванні друку Міністэрства сувязі Беларусі, з 1968 у рэспубліканскім Доме нар. творчасці, з 1972 у Інстытуце мастацтвазнаўства, этнаграфіі і фальклору АН Беларусі, з 1982 у выдавецтве «Юнацтва», з 1984 у часопісе «Полымя», з 1996 кіраўнік і галоўны рэдактар выдавецтва «Беларускі кнігазбор» і галоўны рэдактар выдавецтва «Беллітфонд». Аўтар раздзелаў «Уводзіны» і «Краязнаўства і фальклор» да кн. «Беларуская фалькларыстыка: Эпоха феадалізму» (1989, з Г.Каханоўскім). Складальнік, аўтар уступных артыкулаў і каментарыяў да кніг «Вяселле: Абрад» (1978, у серыі БНТ), «Выбраныя творы» Я. Чачота (1996), А.Міцкевіча (2004), «Філаматы і філарэты» (1998), хрэстаматыі «Літаратура Беларусі: Першая палова XIX ст.» (2000). Стварыў серыю краязнаўчых нарысаў, эцюдаў, эсэ пра Я.Чачота, У.Сыракомлю, П.Багрыма, Ф.Багушэвіча, Я.Купалу, Я.Баршчэўскага, В.Дуніна-Марцінкевіча, Т.Ладу-Заблоцкага, А.Міцкевіча, Т.Зана, якія ўвайшлі ў кн. «Дарога ў сто год» (1974), «Слова пра Сыракомлю» (1975), «Той курган векавечны» (1985), «Лісце забытых алеяў: Эсэ» (1993), «Камяні тых сядзібаў: Шляхі паэтаў XIX ст.» (2004). Пераклаў на бел. мову польскамоўныя творы і фалькл. працы Я.Чачота («Наваградскі замак», 1989), У.Сыракомлі («Добрыя весці», 1993; у сааўтарстве). Выступае ў друку з артыкуламі, рэцэнзіямі па пытаннях літаратуры, фальклору і этнаграфіі.



*К. Цвірка.*

*Тв.*: Хат вячысты дар. Мн., 1982; Бацькаў свет палявы: Выбр. вершы і паэмы. Мн., 1994; Край легенд. Мн., 2004.

*А.С. Ліс.*

**ЦВЫРКУ́Н.** У разуменні беларусаў насякомае Ц. сімвалізавала ўтульнасць і дабрабыт, з'ўлялася «жывым ахоўнікам хаты» і адначасова прадказальнікам сямейнага парадку. Калі Ц. падаваў голас, то хаце нічога не пагражала, у сям'і ўсё было добра і прыстойна. І наадварот, калі сярод зімы Ц. пакідалі хату, гэта ўспрымалася прадказаннем няшчасця (пажару, смерці каго-небудзь са сваякоў). Ц. — недатыкальнае насякомае. Паўсюдна меркавалі: яго забіць — знішчыць добры дух хаты, наклікаць бяду. У некаторых рэгіёнах верылі, што забойства Ц. магло пацягнуць за сабой смерць каханага чалавека.

*А.В.Катовіч.*

**ЦЕ́РАБАЎСКІ НАРО́ДНЫ ФАЛЬКЛО́РНА-ЭТНАГРАФІ́ЧНЫ АНСА́МБЛЬ «КУПАЛІ́НКА»** с е л ь с к а г а к л у б а П е т р ы к а ў с к а г а р а ё н а. Заснаваны ў 1986, з 1994 народны. Кіраўнік — Н.Фаміна. У рэпертуары песні

РЭПАЗІТОРЫЙ БДПУ